УДК 398.332.416:316.7(476.7)

# КАМУНІКАТЫЎНЫ АСПЕКТ КАЛЯДНАЙ АБРАДНАСЦІ ЗАХОДНЯГА ПАЛЕССЯ

***І. В. Хамутова,*** *выкладчык кафедры народна-песеннай творчасці і фальклору ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

**Анатацыя.** Камунікатыўны аспект каляднай абраднасці Заходняга Палесся яскрава прасочваецца праз песенны фальклор, бо песня з'яўляецца люстэркам народнага духу, перадае пачуцці народу і яго патрэбы. Аднак, каб выявіць патаемныя сэнсы, закладзеныя ў калядкі і шчадроўкі, а таксама адрасатаў, да якіх звяртаюцца калядоўшчыкі, спяваючы абрадавыя песні, трэба выкарыстаць метад аналізу ў дачыненні да тэкстаў песень. Падчас даследавання выкарыстана класіфікацыя, распрацаваная іншымі даследчыкамі, дзе выдзелены тры тыпы адрасатаў: эксплiцытныя, імпліцытныя (ці нулявыя) і замяшчаючыя. У выніку аналіза заходнепалескіх калядак і шчадровак зроблена выснова, што сярод эксплiцытных адрасатаў найбольш распаўсюджаны гаспадар, гаспадыня, дзяўчына (дачка гаспадара), хлопец (сын гаспадара), баба, вол. У сваю чаргу адным з самых папулярных імпліцытных адрасатаў з'яўляецца Бог, а сярод замяшчаючых – астральныя свяцілы, жывёлы.

**Ключавыя словы:** Заходняе Палессе, камунікатыўны аспект, калядная абраднасць, калядныя песні, адрасат.

# COMMUNICATIVE ASPECT OF THE CHRISTMAS RITE OF WESTERN POLESYE

***I. Homutova,*** *Teacher of the Department of Folk Song Creativity and Folklore of the Educational Institution «Belarusian State University of Culture and Arts»*

**Abstract.** The communicative aspect of the Christmas rite of West Polesie is clearly traced through song folklore, as the song is a mirror of the folk spirit, it conveys the feelings of the people and their needs. However, in order to reveal the secret meanings inherent in the carols and New Year songs, as well as the addressees, to whom the carolers turn while performing ceremonial songs, it is necessary to use the method of analysis in relation to the lyrics of songs. During the study, a classification developed by other researchers was used, where three types of addressees are distinguished: explicit, implicit (or zero) and substitutes. As a result of the analysis of Western Pole carols and Christmas carols, it was concluded that among the explicit addressees the most common are master, mistress, girl (master's daughter), boy (master's son), grandmother, ox. In turn, one of the most popular implicit addressees is God, and astral luminaries and animals are among the substitutes.

**Keywords:** The West Polesie, the communicative aspect, caroling ritualism, caroling songs, addressee.

Гісторыя чалавецтва сведчыць аб тым, што камунікацыя суправаджае чалавека з самага ўзнікнення чалавецтва. Кожны чалавек – біясацыяльная з’ява, якая развіваецца пад дзеяннем злітых разам дзвюх праграм. Адна з іх – праграма генетычнай інфармацыі ў выглядзе комплексаў генаў, якія атрымліваюцца ад бацькоў, другая – сацыяльная, якая ўспрымаецца праз выхаванне. Дзякуючы сацыяльнай праграме асоба чалавека фарміруецца пад уплывам усёй гісторыі чалавецтва, выкрышталізаванай у тым сучасным яму сацыяльным асяроддзі, у якім ён жыве [7, с. 6]. Кожны чалавек існуе ў біясферы і семіясферы. Устойлівы акт камунікацыі паміж адрасантам і адрасатам будзе працаваць пры ўмове пагружанасці абодвух у адзіную семіятычную прастору. Усе ўдзельнікі камунікацыі павінны мець вопыт і навыкі семіёзіса. Такім чынам, на думку Ю. М. Лотмана, семіятычны вопыт павінен папярэднічаць семіятычнаму акту [6, с. 250].

Увогуле навукоўцы лічаць, што сэнс камунікатыўнага працэсу ў тым, што ён уключае ў сябе ўзаемны абмен сімваламі, значэннямі, інфармацыяй паміж двума (і больш) асобамі, кожная з якіх выступае ў якасці суб’екта сацыяльнага дзеяння. Кожны такі суб’ект імкнецца пэўным чынам уздзейнічаць на рэцыпіента (г. зн. на чалавека, якому адрасавана паведамленне) з мэтай стымуляваць, у некаторым сэнсе, зваротны выні – пачуццё, адзнаку, дзеянне і г. д. [11, с. 15].

На Заходнім Палессі сфарміравана мясцовая семіятычная сістэма са сваімі лакальнымі асаблівасцямі, якая знаходзіць адлюстраванне ў каляднай абраднасці.

Каб вызначыць камунікатыўны аспект каляднай абраднасці трэба разгледзець абрадавы тэкст і зрабіць яго аналіз.

Так, камунікатыўны аспект каляднай абраднасці яскрава прасочваецца не толькі праз рэтуальныя тэксты, але і праз песенны фальклор. У калядках і шчадроўках адлюстраваны пачуцці, думкі і імкненні людзей [3, с. 13]. Кандыдат філалагічных навук А. В. Сядова звяртае ўвагу, што: «Па меркаванні Д. Г. Булгакоўскага, народныя песні пінчукоў служаць выразам народнага духу. Песня – гэта не проста “складзены слоўны твор, а як бы выклічнік, які раптам вырваўся з грудзей”; гэтае люстэрка народнага жыцця, у якім адлюстроўваюцца паняцці і адчуванні народа пры розных абставінах жыцця яго» [9, с. 81].

Сярод шматлікіх напеваў зімовага перыяду календара асаблівую навуковую цікаўнасць уяўляюць старадаўнія калядкі і шчадроўкі – іх прысвячалі розным членам сям’і: гаспадару, гаспадыне, дзяўчыне (даволі часта дачке гаспадара), хлопцу (сыну гаспадара) [5, с. 215–216], бабе, валу [9, с. 82]. Аднак калядны тэкст, як і ўвогуле каляндарна-абрадавы, найбольш камунікатыўна ўхілісты. У песнях, якія выконваюцца падчас каляднага абыходу, не заўсёды можна з упэўненасцю вызначыць, да каго яны звернутыя насамрэч, ці з’яўляюцца камуніканты рэальнымі, бачнымі ці міфалагічнымі, уяўнымі [4, с. 74].

Адпаведна вылучэнне адрасата калядных песень далёка не простае. Даследчыкі выдзяляюць сама меней тры тыпы адрасатаў. Першы тып – эксплiцытныя адрасаты, выразна пазначаныя ў тэксце прамым зваротам [4, с. 76]. Другі – імпліцытныя, ці нулявыя [4, с. 79], калі, звяртаючыся да каго-/чаго-небудзь, апелявалі да сакральнага адрасата. Трэці – замяшчаючыя. Як правіла, гэта рытуальныя дублёры вышэйшых персанажаў [4, с. 81].

Больш падрабязна разгледзем кожны з вышэйпералічаных тыпаў адрасатаў.

Украінскія даследчыкі сведчаць, што асаблівасцю рэгіёна Заходняга Палесся з'яўляецца прыярытэт гаспадарам у вітальных калядках і шчадроўках [2, с. 17], з чым нельга не пагадзіцца Так, дастаткова папулярнай камунікатыўнай сітуацыяй з эксплiцытным адрасатам з'яўляецца запыт да гаспадара на дазвол каледаваць, што дублюецца ў песнях. Напрыклад, можна ўзгадаць калядку, якая запісана падчас экспедыцыі 2020 г. ад носьбітаў традыцыі ў аг. Хацiслаў Маларыцкага раёна Брэсцкай вобласці: «Господарыку, выйды но на двир» [10, с. 145], у якой, акрамя звароту, адразу прапяваецца багацце, якім адарыў Бог гаспадара. Гэта адсылае да атаясамлення рэальнай сям'і праз абрадавую дзею з нябеснай сям'ёй, якая мае ўсе даброты. Р. М. Кавалёва звяртае ўвагу на тое, што ў рытуальны час любая ўключаная ў абрад сям'я матэрыяльна атаясамліваецца са святой. І ў гэтым атаясамленні не было ніякага звання, адна суцэльная магія вяртання да святых вытокаў. Праўда, з часам магічная актуалізацыя нябеснай сям'і стала ўспрымацца ў эстэтычным ключы [4, с. 74–75].

Цікавым прыкладам каляднай песні, адрасаванай да сакральнага адрасата, да Бога, з'яўляецца «Роды, божэ, жыто» [10, с. 149], у якой пералічваюцца ўсе дары («жыта», «грушы», «пчолы», «слывы»), якімі Бога просяць надарыць гаспадароў на наступны год.

Звяртаючыся да трэццяй групы замяшчаючых адрасатаў, трэба ўзгадаць дастаткова распаўсюджаны сюжэт «сям'і ў выяве астральных свяцілаў» [8, с. 69], што было заўважана яшчэ ўкраінскай даследчыцай шчадровак Валыні А. Панчук. Напрыклад, гаспадар у калядках рытуальна тоесны месяцу, гаспадыня – сонцу, іх дзеці – зоркам. Пры персаніфікацыі сонца, месяц і дождж паўстаюць трыма дарагімі госцямі, трыма таварышамі гаспадара ці трыма анёламі [4, с. 81].

Таксама сярод замяшчаючых адрасатаў у тэкстах песень сустракаюцца жывёлы. Так, праз зварот да Цмока-Яшчура ў гульне-карагодзе «Яшчур» (в. Жогалы, Пружанскі раён) [1, с. 145] адбываецца камунікацыя з «іншым» светам.

Падводзячы высновы, трэба адзначыць, што вылучэнне адрасата ў калядках і шчадроўках – даволі складанае пытанне, аднак можна выдзеліць тры тыпы адрасатаў: эксплiцытныя, імпліцытныя (ці нулявыя)

і замяшчаючыя. Усе тыпы адрасатаў яскрава прасочваюцца ў заходнепалескіх калядных песнях.

1. *Беркович, Т.* «Ящер» как песенно-игровая форма зимнего периода в календарно-земледельческой традиции белорусов / Т. Беркович // Lietuvos muzikologija / Lietuvos muzikos ir teatro akad. – 2015. – Т. 16. – С. 143–156.

2. *Бойчук, О.* Календарно-обрядовий фольклор як показник збереження ідентичності регіону та його культурної традиції (на матеріалах із теренів Західного Полісся) / О. Бойчук // Південний архів. Філологічні науки : зб. наук. пр. / Херсон. держ. ун-т. – 2017. – № 67. – С. 15–18.

3. *Дердзяк, Р.* Вклад Польши в мировую сокровищницу рождественского обрядового фольклора / Р. Дердзяк // Музыкальное творчество народов Крыма: песнопения и обряды зимнего цикла / М. Возняк [и др.] ; ред. И. Куровская. – 2018. – С. 13–18.

4. *Ковалева, Р. М.* Горизонты коммуникации в календарно-обрядовом фольклоре: сакральное и мирское / Р. М. Ковалева // Национальные культуры в межкультурной коммуникации : сб. науч. ст. по мат. II Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 12–13 апр. 2017 г. / Белорус. гос. ун-т ; редкол.: Э. А. Усовская (отв. ред.) [и др.]. – 2017. – С. 73–84.

5. *Колодюк, А.* Календарные обряды и песни средней Волыни: состояние традиции на рубеже XX–XXI веков / А. Колодюк // Tradicija ir Dabartis / Acad. of Arts. – Klaipėda, 2017. – Vol. 12. – С. 213–224.

6. *Лотман, Ю. М.* Семиосфера : сб. / Ю. М. Лотман. – СПб. : Искусство-СПБ, 2000. – 703 с.

7. Методологические вопросы современной науки: вопросы философии : межвуз. сб. / Кишинев. гос. ун-т ; редкол.: Л. К. Гришанов (отв. ред.) [и др.]. – Кишинев : Штиинца, 1978. – 120 с.

8. *Панчук, О.* Із спостережень над структурою щедрівок Волині / О. Панчук // Нар. творчість та етнографія. – 2005. – № 1. – С. 69–75.

9. *Седова, О. В.* Особенности колядных песен пинчуков (на материале этнографического сборника Д. Г. Булгаковского «Пинчуки») / О. В. Седова // Актуальные проблемы социально-гуманитарных наук : сб. науч. тр. по мат. Междунар. науч.-практ. конф., Белгород, 30 нояб. 2017 г. : в 6 ч. / Агентство перспектив. науч. исслед. ; под общ. ред. Е. П. Ткачевой. – 2017. – Ч. 1. – С. 81–83.

10. *Хамутова, І. В.* Традыцыйны светапогляд і эстэтыка калядных песень палескай вёскі Хацíслаў / І. В. Хамутова // Фальклярыстычныя даследаванні: кантэкст. Тыпалогія. Сувязі : зб. навук. арт. / рэдкал.: В. П. Рагойша (старш.) [і інш.] ; пад рэд. Т. А. Марозавай, С. В. Шамякінай. – Мінск : РІВШ, 2022. – Вып. 16. – С. 144–151.

11. *Чамкин, А. С.* Основы коммуникологии (теория коммуникации) : учеб. пособие / А. С. Чамкин. – М. : Инфра-М, 2013. – 349 с.